

**Больш за 60 жанчын — працаўніц сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі з усіх куточкаў Беларусі, у тым ліку з Бабруйскага раёна, сустрэліся ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу**.

*— Гэта было вельмі цудоўнае мерапрыемства, — падзялілася ўдзельніца сустрэчы ад Бабруйскага раёна Ніна Наскова, рабочая па абслугоўванні і ўтрыманні дамоў і домаўладанняў УКП "Жылкамгас", якая працуе ў пас. Рэдкі Рог. — Мерапрыемства мяне вельмі ўразіла, парадавалі добрыя словы ў адрас работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Прыемна, што наша праца навідавоку. А, галоўнае, яе ацэньваюць людзі. Працуючы з 8 да 17 гадзін, мы стараемся зрабіць усё магчымае, каб вуліцы і дваровая тэрыторыя населенага пункта радавалі жыхароў чысцінёй і парадкам. А сёлета — яшчэ і камфортам, бо снегу было як ніколі.*

Пацверджаннем таго, што праца работнікаў ЖКГ годна ацэньваецца, стаў і той факт, што шэрагу працаўніц сферы за шматгадовую і добрасумленную працу ўручылі ўдзячнасці.




САВЕТ РЭСПУБЛІКІ
НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ